# Беларуская мова. IV клас

## Раздзел «Сказ»

Вывучэнне раздзела «Сказ» у IV класе накіравана на фарміраванне ў навучэнцаў паняцця пра аднародныя члены сказа, пра сродкі сувязі аднародных членаў сказа (інтанацыя, злучнікі ***і, а, але***), на знаёмства з правіламі пастаноўкі знакаў прыпынку паміж аднароднымі членамі, на выпрацоўку ўменняў вызначаць і ўжываць у сказах аднародныя члены.

Асноўнай прыметай аднароднасці членаў сказа з'яўляецца тоеснасць іх функцый, абумоўленая тым, што ў структуры сказа яны займаюць адно сінтаксічнае месца. У чацвёртым класе вучні засвойваюць аднародныя члены на лагічна-граматычнай аснове (прымаецца пад увагу пераважна тое, што яны адказваюць на адно пытанне і паясняюць адно і тое ж слова ў сказе). У ходзе выканання практыкаванняў чацвёртакласнікі практыкуюцца ў вылучэнні слова, ад якога трэба ставіць пытанне, у пастаноўцы пытанняў да аднародных членаў сказа, пашыраюць сказы аднароднымі членамі, вызначаюць галоўныя і даданыя аднародныя члены сказа.

Сінтаксічнае раўнапраўе аднародных членаў абумоўлівае асобы характар сувязі паміж імі — злучальны. Разам з тым сінтаксічная раўнацэннасць аднародных членаў абумоўлена характарам іх сувязі. Важным сродкам выражэння злучальнай сувязі з'яўляецца інтанацыя. У працэсе выканання заданняў навучэнцы практыкуюцца ў распазнаванні на слых і правільным інтанаванні сказаў з аднароднымі членамі, засвойваюць, што інтанацыя ўдзельнічае ў забеспячэнні сувязі слоў і ў пэўных умовах самастойна адлюстроўвае лагічна-сінтаксічныя адносіны паміж формамі слоў у сказе. Асноўны матэрыяльны сродак выражэння злучальнай сувязі — злучальныя злучнікі. Яны з'яўляюцца не толькі паказчыкамі сувязі, але і сродкамі выражэння разнастайных семантыка-сінтаксічных адносін паміж членамі аднароднага рада. Таму пры вывучэнні раздзела чацвёртакласнікі знаёмяцца з роляй злучнікаў у сказах з аднароднымі членамі, вучацца будаваць сказы з аднароднымі членамі з выкарыстаннем злучнікаў ***і, а, але***. Акрамя таго, навучэнцы практыкуюцца ў пастаноўцы коскі ў сказах з аднароднымі членамі, звязанымі як бяззлучнікавай, так і злучальнай сувяззю.

Развіццю звязнага маўлення вучняў спрыяюць заданні, якія прадугледжваюць дапаўненне тэкстаў сказамі з аднароднымі членамі, ужыванне гэтых сінтаксічных канструкцый ва ўласных вусных і пісьмовых выказваннях.

### Урок 12. Тыпы і будова сказа

***Мэты:*** узнавіць веды навучэнцаў пра тыпы сказаў па мэце выказвання і інтанацыі, пра знакі прыпынку ў канцы сказа, пра будову сказа; развіваць інтанацыйныя навыкі, граматычны лад маўлення, лагічнае мысленне навучэнцаў; выхоўваць культуру маўлення.

***Абсталяванне:*** плакат, на якім адлюстраваны алгарытм вызначэння сувязі слоў у сказе, сігнальныя карткі.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце тэкст, які ў вас атрымаўся. (Правільная паслядоўнасць сказаў: 1 — 3 — 2 — 5 — 4.) Да якога тыпу ён належыць? *(Тэкст-апісанне.)* Які загаловак можна яму даць? *(«Зубры на паляне», «Мама-абаронца».)* На што ўказвае падабраны загаловак: на тэму ці на асноўную думку? *(Загаловак «Зубры на паляне» — на тэму, «Мама-абаронца» — на асноўную думку.)* Назавіце словы, якія характарызуюць паводзіны зубрыцы. *(Насцярожана, трывожна аглядалася, уцягвала ноздрамі паветра.)* Якімі словамі апісваецца зубраня? *(Маленькае і бездапаможнае.)* Якой часцінай мовы з'яўляюцца гэтыя словы? Якія правілы правапісу вы прымянілі, каб уставіць у словы прапушчаныя літары? *(Правілы правапісу літар **д–дз, у–ў, е, ё–я**, прыставак, якія заканчваюцца на **з, с**.)* Раскажыце гэтыя правілы. Пры запісе якіх слоў выкарысталі правіла правапісу літар **е, ё–я**? *(**Насця**рожана, **не**прыемнасцей.)* Якія літары ўставілі ў гэтыя словы? Чаму? Пры запісе якіх слоў выкарысталі правіла правапісу літар **у–ў**? ***(Уцягвала, ахоўваць.)*** Якія літары ўставілі ў гэтыя словы? Чаму? Якую літару ўставілі ў слова ***бездапаможнае***? Чаму? Выдзеліце корань і прыстаўку ў гэтым слове.

**II. Абагульненне.**

— Які раздзел падручніка мы закончылі вывучаць? *(Тэкст.)* Давайце ўспомнім, аб чым мы даведаліся пры вывучэнні гэтага раздзела.

Праца ў парах «Настаўнік — вучань».

Адзін вучань адказвае на пытанні на с. 41, другі кантралюе правільнасць адказаў. Вучань, які выконвае ў пары ролю настаўніка, фіксуе знакам «+» на картцы правільныя адказы, а ў вуснай форме, пры неабходнасці, выпраўляе недакладнасці ў адказах напарніка. Правільнасць адказу на пытанне, якое выклікала цяжкасці, і дакладнасць выпраўлення

правяраецца двума вучнямі па падручніку. Пасля таго як будуць атрыманы адказы на ўсе пытанні, кожная пара вучняў падымае сігнальную картку. Настаўнік звяртаецца да ўсяго класа і запытваецца ў дзяцей:

— Пры адказе на якое пытанне ўзніклі цяжкасці? (Агучваюцца па чарзе пытанні, якія выклікалі цяжкасці.) Да якой тэмы трэба звярнуцца яшчэ раз, каб правільна адказаць на гэтае пытанне (пытанні)? Дзе ў падручніку знаходзіцца адказ на пытанне? (Можна прапанаваць варыянт працы, калі вучні ў парах абмяркоўваюць адказы на пытанні, а пасля прагаворваюць па чарзе ўсе адказы ўслых. Пры ўзнікненні цяжкасцей настаўнік просіць звярнуцца да адпаведных старонак падручніка.)

**III. Новы матэрыял.**

**1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.**

— Нагадайце мне, з чаго складаецца тэкст. *(Са сказаў.)* Мы пачынаем вывучаць тэму «Сказ». Сёння на ўроку ўспомнім вядомыя нам прыметы сказа.

**2. Праца з падручнікам.**

— Разгледзьце схему на старонцы 42. Выразна прачытайце сказы ў левым слупку. (Тры вучні па чарзе чытаюць сказы.) Якімі бываюць сказы па мэце выказвання? *(Апавядальнымі, пытальнымі, пабуджальнымі.)* Які з прачытаных сказаў з'яўляецца апавядальным (пытальным, пабуджальным)? Які знак прыпынку стаіць у канцы яго? Прачытайце кожны з трох сказаў з клічнай інтанацыяй. (Вучні практыкуюцца ў чытанні апавядальнага, пытальнага і пабуджальнага сказаў з клічнай інтанацыяй.) Якія знакі прыпынку могуць стаяць у канцы клічных сказаў? *(Клічнік або пытальнік і клічнік адначасова.)*

Практыкаванне 59.

— Прачытайце сказы першай групы, вызначыце іх тып па мэце выказвання. (Вучні па чарзе чытаюць першы — чацвёрты сказы, вызначаюць іх тыпы: першы — пытальны, другі і трэці — апавядальныя, чацвёрты — пабуджальны. Звяртаецца ўвага на тое, што трэці сказ патрабуе клічнай інтанацыі: слова *які* ў ім дапамагае перадаць пачуццё захаплення.) Запішыце гэтыя сказы, пастаўце ў канцы іх патрэбныя знакі прыпынку. (Запіс з каменціраваннем.) Самастойна прачытайце сказы другой групы, вызначыце іх тыпы, спішыце і пастаўце патрэбныя знакі прыпынку ў канцы сказаў. (Выкананне задання вучнямі.) Прачытайце запісаныя сказы з патрэбнай інтанацыяй. Назавіце тып сказа і знак прыпынку, які паставілі ў канцы. (Вучні па чарзе зачытваюць сказы. Арганізоўваецца франтальная праверка.) Прачытайце яшчэ раз пытальныя сказы. Назавіце ў іх пытальныя словы. (Вучні называюць і падкрэсліваюць пытальныя словы ***ці, дзе***.)

— Давайце ўспомнім, як вызначаецца сувязь слоў у сказе. Прачытайце сказ у рамцы на старонцы 43. Якім членам сказа з'яўляецца ў ім слова *Ірынка*? *Прыбірае*? Як падкрэсліваецца дзейнік? Выказнік? Як называюцца дзейнік і выказнік? *(Галоўныя члены сказа.)* Якімі членамі сказа з'яўляюцца словы *працавітая, у кватэры*? *(Даданымі.)* Які з даданых членаў сказа паясняе дзейнік? Пастаўце пытанне ад дзейніка да слова *працавітая.* Пастаўце пытанне ад выказніка да слова *у кватэры.* Пералічыце паслядоўнасць дзеянняў пры вызначэнні сувязі слоў у сказе. (Вучні ўзнаўляюць алгарытм вызначэння сувязі слоў у сказе самастойна або з апорай на плакат, які вывешвае настаўнік.)

Практыкаванне 60.

— Прачытайце скорагаворку. (Вучні спачатку чытаюць скорагаворку, а потым трэніруюцца ў хуткім і правільным яе вымаўленні.) Растлумачце правапіс выдзеленых літар і слоў. (Адзін вучань тлумачыць правапіс літары **а** ў ненаціскных складах, правапіс літары **я** ў першым складзе перад націскам, правапіс **ў** пасля галосных, спосаб перадачы на пісьме мяккага зычнага [ц'].) Запішыце скорагаворку па памяці. (Самастойнае выкананне задання вучнямі. Самаправерка шляхам параўнання запісанага сказа з узорам у кнізе.) Падкрэсліце ў запісаным сказе дзейнік і выказнік. (Пасля самастойнага выканання задання вучнямі праводзіцца ўзаемаправерка.)

Практыкаванне 61.

— Прачытайце словы. (Вучні чытаюць самі сабе.) На які склад можа падаць націск у слове, якое з'яўляецца прыметнікам? Не спяшайцеся даваць адказ, пакуль не пазнаёміцеся са словам у слоўніку. (Вучні самастойна знаёмяцца з матэрыялам, які змешчаны ў слоўніку да практыкавання, і заўважаюць, што ёсць слова *любая — кожная, усякая,* а ёсць слова *любая — мілая, любімая.*) У практыкаванні выкарыстоўваецца слова *любая.* Якое значэнне яно мае? Са слоў *пчолка, на, ляціць, любую кветку* неабходна скласці сказ, які адпавядае прапанаванай схеме. Разгледзьце схему сказа. Якія члены сказа павінны быць у ім? *(Дзейнік, выказнік, два даданыя члены.)* Якім членам сказа будзе з'яўляцца першае слова ў сказе? Другое? Трэцяе і чацвёртае? На якое пытанне будзе адказваць дададзены член сказа, які паясняе выказнік? *(Куды?)* Другі дададзены член сказа? *(Якую?)* Складзіце сказ. (Вучні вусна складаюць сказ і разам з настаўнікам правяраюць адпаведнасць яго схеме.) Сказ *Пчолка ляціць на любую кветку* — гэта прыказка. Якое слова часта выкарыстоўваюць для апісання пчолкі? *(Працавітая.)* Сапраўды, і пра чалавека часта кажуць *працавіты, як...* (Вучні дагаворваюць выказванне.) Якую працу чалавек звычайна выконвае з задавальненнем? *(Любімую.)* Прыказка якраз і нагадвае нам пра гэта.

Практыкаванне 62.

— Прачытайце загадку. (Вучні чытаюць самі сабе.) Якую адгадку яна мае? *(Алоўкі.)* Спішыце, устаўляючы ў словы патрэбныя літары. (Адзін вучань запісвае сказ на дошцы з каменціраваннем, астатнія — у сшытках.) Вызначыце па пытаннях сувязь слоў у сказе. (Вучань каля дошкі вызначае сувязь слоў у сказе, астатнія сочаць за правільнасцю выканання задання.) Давайце пабудуем схему сказа. (Заданне выконваецца калектыўна: на дошцы і ў сшытках.)

**IV. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 63.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе спісаць верш, раскрываючы дужкі, падкрэсліць у першым сказе галоўныя члены. Акрамя таго, трэба будзе знайсці ў вершы аднакаранёвыя словы і выдзеліць у іх корань.

**V. Вынік урока.**

— Якімі бываюць сказы па мэце выказвання і інтанацыі? Якія члены сказа называюцца галоўнымі? Як вызначаецца сувязь слоў у сказе?

## Урок 13. Аднародныя члены сказа

***Мэты:*** пазнаёміць з прыметамі аднародных членаў сказа, з інтанацыяй, якой звязваюцца аднародныя члены сказа; вучыць знаходзіць у сказах аднародныя дзейнікі, выказнікі, даданыя члены, будаваць сказы з аднароднымі членамі, развіваць інтанацыйныя навыкі, граматычны лад маўлення, камунікатыўныя ўменні навучэнцаў; выхоўваць цікавасць да вывучэння беларускай мовы.

***Абсталяванне:*** апорная схема.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце верш, які вы запісалі дома. Чаму здзівіўся баравік? *(Што ў сонейка няма ножак.)* Назавіце галоўныя члены ў першым сказе. Вусна пастаўце пытанні да даданых членаў сказа. Якое слова ў сказе ўжыта ў пераносным значэнні? *(Выбег.)* Назавіце ў вершы аднакаранёвыя словы. *(Бору, баравік.)* Які корань вы выдзелілі ў гэтых словах? Назавіце галосныя гукі, якія змяніліся ў корані слоў. Чаму адбылася гэтая змена гукаў? Пры запісе якога яшчэ слова вы карысталіся правілам правапісу літар ***о, э–а***? *(Расе.)* Якую літару вы ўставілі ў слова *расе*? Чаму? Якім правілам правапісу карысталіся пры запісе слоў *выбег, ножкі*? Якія літары ўставілі ў гэтыя словы? Якія праверачныя словы падабралі да іх? *(Бягу, ножак.)*

**II. Новы матэрыял.**

**1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.**

— Вам ужо знаёмыя галоўныя і даданыя члены сказа. Сёння мы даведаемся, якія члены сказа называюцца аднароднымі, будзем вучыцца знаходзіць іх у сказах.

**2. Праца з падручнікам.**

Практыкаванне 64.

— Разгледзьце малюнак. Прачытайце сказы. (Вучні чытаюць сказы самі сабе.) Назавіце ў кожным сказе галоўныя члены. Да якога слова ў кожным сказе адносіцца даданы член сказа? На якое пытанне ён адказвае? Чым падобныя гэтыя сказы? *(У іх адны і тыя ж галоўныя члены: Мікіта купіў.)* Якімі членамі сказа адрозніваюцца гэтыя сказы? *(Даданымі: альбом, алоўкі, фарбы.)* Замяніце тры сказы адным. Запішыце сказ, які ў нас атрымаўся. (Адзін вучань запісвае сказ на дошцы, астатнія — у сшытках.) Падкрэсліце ў запісаным сказе галоўныя члены. Пастаўце пытанні да даданых членаў сказа. Ад якога слова вы ставілі пытанні? *(Ад слова **купіў**.)* Вы паставілі адно і тое ж пытанне ці розныя?

Праца з правілам.

Настаўнік чытае правіла на с. 45 і задае пытанні: да якога слова ў сказе адносяцца аднародныя члены сказа? На якое пытанне яны адказваюць? (Падчас адказаў вучняў на дошцы складаецца з частак апорная схема.)




Вучні самастойна перачытваюць правіла.

— Назавіце аднародныя члены ў запісаным сказе. *(Альбом, алоўкі, фарбы.)* На якое пытанне яны адказваюць? *(Што?)* Да якога слова ў сказе адносяцца? *(Купіў.)*

Практыкаванне 65.

— Прачытайце першую пару сказаў. Вусна вызначыце сувязь слоў у іх па пытаннях. (Адзін з вучняў вызначае сувязь слоў у сказах, астатнія кантралююць правільнасць выканання задання. Абавязкова пытанне ставіцца ад слова, якое паясняецца. Напрыклад: *Дзеці (што робяць?) пішуць, дзеці (што робяць?) чытаюць, дзеці (што робяць?) малююць.*) У якім з гэтых сказаў ёсць аднародныя члены? *(Дзеці пішуць, чытаюць, малююць.)* Якія гэта члены сказа: дзейнікі ці выказнікі? *(Выказнікі.)* Запішыце гэты сказ. (Вучань, які вызначаў сувязь слоў у сказах, запісвае сказ на дошцы, астатнія запісваюць яго ў сшытках.) Разгледзьце схемы сказаў, прапанаваныя ў практыкаванні. Якая з іх адпавядае запісанаму сказу? *(Другая.)* Дакажыце. (Аналагічна аналізуюцца астатнія пары сказаў.)

Праца з рубрыкай «Завяжы вузялок!».

Настаўнік засяроджвае ўвагу вучняў на тым, што аднароднымі могуць быць любыя члены сказа, і дае заданне вучням пазнаёміцца з матэрыялам рубрыкі, змешчаным уверсе старонкі 46.

Практыкаванне 66.

— Прачытайце. Вызначыце сувязь слоў у сказе. (Адзін з вучняў вызначае сувязь слоў у сказе.) Якімі членамі сказа з'яўляюцца выдзеленыя словы? *(Даданымі.)* Назавіце слова, да якога адносяцца аднародныя члены сказа. *(Прынéслі.)* Вы ўжо можаце знаходзіць у сказах аднародныя члены. Зараз мы будзем вучыцца выразна чытаць сказы, у якіх ёсць аднародныя члены. Прачытайце скорагаворку. Выдзеліце голасам назвы грыбоў. Зрабіце невялікую паўзу ў месцах, пазначаных рыскамі. (Настаўнік можа спачатку прапанаваць узор выразнага чытання скорагаворкі. У далейшым вучні практыкуюцца спачатку ў выразным чытанні ўпаўголаса ў парах, потым — уголас перад усім класам.)

Праца з рубрыкай «Завяжы вузялок!».

Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на тое, што аднародныя члены сказа вымаўляюцца з інтанацыяй пералічэння: на кожны з іх ставіцца націск, паміж

імі робіцца паўза. Ён просіць перачытаць матэрыял рубрыкі на старонцы 46 і адказаць на пытанне: з якой інтанацыяй вымаўляюцца аднародныя члены сказа?

**III. Замацаванне.**

Развіццё маўлення.

Практыкаванне 67.

— Разгледзьце малюнкі на старонцы 46. Што робіць дзяўчынка? *(Спявае, іграе на скрыпцы.)* Прачытайце, пра што запыталася бабуля ва ўнучкі. (Адзін вучань чытае словы бабулі.) Адкажыце на пытанне бабулі сказам з аднароднымі членамі. (Вучні спрабуюць скласці патрэбны сказ: *Я спяваю, іграю на скрыпцы.*) Вымавіце гэты сказ яшчэ раз з патрэбнай інтанацыяй.

Разгледзьце малюнак уверсе старонкі 47. Якія прадукты ляжаць на кухонным стале? *(Алей, соль, мука, яйкі, бульба.)* Прачытайце, пра што запыталася дачка ў мамы. (Адзін вучань чытае словы дачкі.) Адкажыце на пытанне дачкі сказам з аднароднымі членамі. (Вучні спрабуюць скласці патрэбны сказ: *Мы возьмем бульбу, яйкі, муку, соль і алей.*) Вымавіце гэты сказ яшчэ раз з патрэбнай інтанацыяй. (Аналагічная праца арганізоўваецца па трэцім малюнку.) Разыграйце ў парах адну размову на выбар. (Вучні ў парах трэніруюцца ў выразным вымаўленні пытанняў і адказаў. Заслухоўваюцца некалькі пар вучняў.)

Практыкаванне 68.

— Прачытайце назву верша. Як вы думаеце, аб чым ён? (Вучні выказваюць свае меркаванні.) Давайце праверым нашы здагадкі. Прачытайце верш. (Адзін вучань чытае, астатнія слухаюць і сочаць за правільнасцю чытання.) Пра што людзі часта мараць восенню? Чаму? (Выслухоўваюцца адказы вучняў.) Назавіце ў вершы словы, ужытыя ў пераносным значэнні. *(Лічаць дзянькі.)* Якое значэнне мае гэты выраз? *(Чакаюць зіму. Не могуць дачакацца зімы.)* Спішыце, устаўляючы ў словы патрэбныя літары. (Запіс з каменціраваннем.) Падкрэсліце ў першым сказе дзейнік і выказнік. Назавіце ў ім аднародныя члены. *(Аднародныя дзейнікі: **санкі, лыжы, канькі**.)* Да якога слова ў сказе яны адносяцца? *(Да выказніка **лічаць**.)*

**IV. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 69, правіла.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе спісаць сказы, падкрэсліць у іх галоўныя члены. Акрамя таго, вам трэба будзе знайсці ў сказах аднародныя члены.

**V. Вынік урока.**

— Якія члены сказа называюцца аднароднымі? Як вымаўляюцца аднародныя члены сказа? Складзіце сказ з аднароднымі членамі і выразна вымавіце яго. (Заслухоўваюцца сказы, якія склалі некалькі вучняў.)

## Урок 14. Сказы з аднароднымі членамі

***Мэты:*** адпрацоўваць уменне знаходзіць у сказах аднародныя члены, вызначаць іх сінтаксічную функцыю, будаваць сказы з аднароднымі членамі, правільна інтанаваць іх; узбагачаць слоўнік навучэнцаў прыказкамі пра працу, развіваць вуснае звязнае маўленне; выпрацоўваць пунктуацыйныя навыкі; выхоўваць любоў да прыроды.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Чым падобныя па будове ўсе сказы, якія вы запісалі пры выкананні дамашняга практыкавання? *(Гэта сказы з аднароднымі членамі.)* Спачатку выразна прачытайце сказы з аднароднымі дзейнікамі. *(№ 2, 7.)* Зараз выразна прачытайце сказы з аднароднымі выказнікамі. *(№ 1, 5.)* Якімі членамі сказа з'яўляюцца аднародныя члены ў астатніх сказах? *(Даданымі.)*

— Якія члены сказа называюцца аднароднымі? Як вымаўляюцца аднародныя члены сказа?

**II. Замацаванне.**

***Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 70.

— Прачытайце першы сказ. Вызначыце сувязь слоў у ім па пытаннях. (Адзін вучань знаходзіць у сказе дзейнік, выказнік, ставіць пытанні ад дзейніка да дадзеных членаў сказа, заўважае, што пытанні гэтыя аднолькавыя і што дадзеныя члены сказа з'яўляюцца аднароднымі. Астатнія вучні сочаць за правільнасцю выканання задання.) Да якога слова ў сказе адносяцца аднародныя члены? *(Да слова **маланка**.)* Разгледзьце схемы сказаў, прапанаваныя ў практыкаванні. Якая з іх адпавядае першаму сказу? *(Першая.)* Дакажыце. (Аналагічна аналізуюцца астатнія сказы.) Спішыце сказы ў той паслядоўнасці, у якой змешчаны схемы да іх. (Адзін вучань выконвае заданне на дошцы, астатнія — у сшытках. У кожным сказе графічна выдзяляецца слова, да якога адносяцца аднародныя члены.) Што атрымалася ў выніку спісвання? *(Тэкст.)* Падбярыце да яго загаловак. *(«Навальніца», «Пачатак навальніцы».)*

Праца са слоўнікавым словам **грымець:**

— Сёння мы пазнаёмімся з правапісам слоўнікавага слова *грымець*. Давайце вымавім гэтае слова ўсе разам. Што можа грымець? (Вучні выказваюць свае меркаванні. Напрыклад, гром, гарматы (пушка), марш, слава.) Колькі складоў у слове *грымець*? Які з іх націскны? Які галосны гук вымаўляецца ў ненаціскным складзе? Якой літарай ён перадаецца на пісьме? Колькі гукаў у слоўнікавым слове? Назавіце іх па парадку. Колькі літар у слове *грымець*? Чаму колькасць гукаў і літар у ім не супадае?

— Запішыце слоўнікавае слова, прагаворваючы яго так, як будзеце пісаць. (Самастойны запіс слова вучнямі.) Знайдзіце ў запісаных сказах слова, аднакаранёвае да слоўнікавага. Выдзеліце корань у аднакаранёвых словах.

Практыкаванне 71.

— Мы толькі што прачыталі тэкст, у якім апісваецца пачатак навальніцы. Давайце зараз прачытаем верш, у якім апісваецца разгар навальніцы. (Адзін вучань чытае верш услых, астатнія сочаць за правільнасцю чытання.) На каго падобная навальніца ў вершы? *(На казачнае страшыдла.)* Назавіце словы, якія падказалі вам гэта. *(Цёмнае страшыдла, патушыла, раздражніла.)* Дакажыце, што выдзеленыя словы з'яўляюцца аднароднымі

членамі сказа. Якую ролю ў сказе яны выконваюць? (Адзін вучань устанаўлівае сувязь слоў у першым сказе па пытаннях, заўважае, што словы *патушыла, зачыніла, раздражніла* адносяцца да слова *страшыдла* і адказваюць на адно і тое ж пытанне *што зрабіла?.*) Спішыце першы сказ. Падкрэсліце ў ім галоўныя члены. (Запіс з каменціраваннем.) Знайдзіце слова, аднакаранёвае да слова *грымець. (Грым-от-ы.)* Разбярыце яго па саставе. (Пасля самастойнага выканання задання вучнямі арганізоўваецца франтальная праверка.)

Практыкаванне 72.

— З прапанаваных частак састаўце прыказкі. (Вучні аднаўляюць дэфармаваныя прыказкі. Звяртаецца ўвага на значэнне слоў *бясчэсціць (ганьбіць, няславіць; узводзіць няславу на кагосьці), крэпіць (робіць больш моцным), цешыць (прыносіць задавальненне).*) Якіх людзей яны ўслаўляюць? *(Працавітых, гаспадарлівых.)* Запішыце прыказкі, раскрываючы дужкі. Падкрэсліце ў сказах дзейнік і выказнік, назавіце аднародныя члены. (Запіс з каменціраваннем.)

Практыкаванне 73.

— Разгледзьце малюнкі на старонцы 50. Якія лебедзі плаваюць на возеры? Хто назірае за лебедзямі? Разгледзьце першую схему сказа. Якія аднародныя члены ёсць у сказе? *(Аднародныя даданыя члены сказа.)* Да якога слова ў сказе адносяцца аднародныя даданыя члены? *(Да дзейніка.)* Ці будзе аднародным ім той даданы член сказа, які адносіцца да выказніка? *(Не.)* Чаму? *(Гэты даданы член сказа адносіцца да іншага слова ў сказе.)* Састаўце па першым малюнку сказ з аднароднымі членамі, які адпавядае першай схеме. *(Белыя, чорныя лебедзі плаваюць на возеры.)* Разгледзьце другую схему сказа. Якія аднародныя члены ёсць у ім? *(Аднародныя дзейнікі.)* Дзе ў сказе знаходзяцца аднародныя дзейнікі? *(У канцы сказа.)* З якога члена сказа пачынаецца сказ? *(З даданага.)* Састаўце па другім малюнку сказ з аднароднымі членамі, які адпавядае другой схеме. *(За птушкамі назіраюць тата, мама, дачушка.)*

**III. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 74.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе вызначыць межы сказаў у тэксце, запісаць тэкст, расставіўшы патрэбныя знакі прыпынку, падкрэсліць дзейнік і выказнік у сказах з аднароднымі членамі.

**IV. Вынік урока.**

— Якія члены сказа называюцца аднароднымі? Якую ролю ў сказе могуць выконваць аднародныя члены? *(Дзейніка, выказніка, даданых членаў сказа.)* Складзіце сказ з аднароднымі дзейнікамі (выказнікамі, даданымі членамі сказа).

## Урок 15. Сродкі сувязі аднародных членаў сказа

***Мэты:*** пазнаёміць са сродкамі сувязі аднародных членаў сказа (інтанацыя, злучнікі), адпрацоўваць уменні знаходзіць сказы з аднароднымі членамі ў кантэксце, вызначаць сродкі сувязі аднародных членаў у сказе, будаваць сказы з аднароднымі членамі; выпрацоўваць інтанацыйныя навыкі, граматычны лад маўлення, вуснае звязнае маўленне навучэнцаў; выхоўваць клапатлівыя адносіны да людзей.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Колькі сказаў у тэксце, які вы запісалі дома? *(Пяць.)* Прачытайце сказ, у якім няма аднародных членаў. *(Першы сказ.)* Якое слова вы запісалі з вялікай літары? Дзе паставілі кропку? Прачытайце сказ з аднароднымі даданымі членамі. *(Другі сказ.)* Якое слова вы запісалі з вялікай літары? Дзе паставілі кропку? Назавіце словы, якія з'яўляюцца даданымі членамі. *(Жоўтае, чырвонае.)* Як вы думаеце, які знак прыпынку трэба паставіць паміж аднароднымі членамі? *(Коску.)* Магчыма, хтосьці здагадаўся і паставіў коску, калі выконваў дамашняе заданне? Дзе вы яе паставілі? *(Пасля слова* ***жоўтае****.)* Прачытайце сказы з аднароднымі дзейнікамі. (Вучні па чарзе выразна чытаюць тры апошнія сказы.) Паміж якімі словамі трэба паставіць коскі ў трэцім (чацвёртым, пятым) сказе? Якую назву можна даць тэксту? *(«Падрыхтоўка да зімы», «Восенню».)* Абгрунтуйце свой адказ.

— Вы ўжо ведаеце, якія члены сказа называюцца аднароднымі. Нагадайце адзін аднаму правіла. (Вучні ў парах расказваюць адзін аднаму правіла.) Калі вы выконвалі дамашняе заданне, то заўважылі, што аднародныя члены могуць аддзяляцца на пісьме адзін ад аднаго знакам прыпынку. Які гэта знак прыпынку? *(Коска.)* Аднак вы пакуль яшчэ не ведаеце правілаў пастаноўкі коскі.

**II. Новы матэрыял.**

**1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.**

— Сёння на ўроку мы даведаемся, як звязваюцца паміж сабой аднародныя члены сказа.

**2. Праца з падручнікам.**

Практыкаванне 75.

— Выразна прачытайце першую пару сказаў. (Некалькі вучняў практыкуюцца ў чытанні сказаў з захаваннем інтанацыі пералічэння.) Назавіце ў іх аднародныя члены. *(Па плошчы, па парку.)* Якім словам адрозніваюцца паміж сабой два сказы? *(Словам* ***і****.)* Што злучае слова ***і*** ў сказе? *(Аднародныя члены.* Аналагічна аналізуюцца астатнія пары сказаў.*)* Запішыце сказы са словамі ***і, а, але***.

Праца з правілам.

Настаўнік чытае правіла на старонцы 45 і задае пытанні: як звязваюцца паміж сабой аднародныя члены сказа? Як называюцца словы ***і, а, але***? Вучні самастойна перачытваюць правіла.

— Калі вы запісвалі сказы з аднароднымі членамі, то маглі заўважыць, што не ў кожным з іх стаіць коска. У якім сказе паміж аднароднымі членамі адсутнічае коска? *(У тым сказе, у якім аднародныя члены звязаны злучнікам* ***і****.)*

Практыкаванне 76.

— Прачытайце тэкст. (Чытанне вучнямі па частках.) Як Валя дапамагла хлопчыку знайсці рукавічку? (Выслухоўваюцца адказы вучняў.) Знайдзіце ў тэксце сказы з аднароднымі членамі. Выразна прачытайце іх. (Адзін вучань зачытвае першы сказ.) Назавіце ў ім аднародныя члены сказа. *(Валя — што зрабіла? — **выканала, выйшла**.)* Як яны звязаны паміж сабой: інтанацыяй і злучнікамі ці толькі інтанацыяй? *(Толькі інтанацыяй.)* Знайдзіце і прачытайце наступны сказ. (Другі вучань зачытвае другі сказ.) Назавіце ў ім аднародныя члены сказа. *(Двор — які? — **невялікі, утульны**.)* Як яны звязаны паміж сабой? *(Інтанацыяй пералічэння і злучнікам **але**.* Вучні па чарзе знаходзяць і зачытваюць наступныя сказы: трэці — пяты, дзявяты — адзінаццаты, трынаццаты, пятнаццаты сказы. Свой выбар яны абавязкова абгрунтоўваюць.*)* Самастойна выпішыце з тэксту любыя тры сказы, у якіх аднародныя члены звязаны злучнікамі ***і, а, але***. Падкрэсліце ў гэтых сказах галоўныя члены. (Пасля выканання задання арганізоўваецца ўзаемаправерка напісанага. Настаўнік просіць дзяцей прасачыць, каб знакі прыпынку ў запісаных сказах былі расстаўлены так, як у падручніку.)

Развіццё маўлення.

— Вызначыце тып тэксту «Рукавічка» *(Апавяданне.)* На колькі частак можна яго падзяліць? *(На тры.)* Пра што ідзе размова ў першай частцы тэксту? *(Пра тое, як дзяўчынка шукала ў двары сябровак.)* Прачытайце яе. *(Першы — другі абзацы.)* Пра што ідзе размова ў другой частцы тэксту? *(Пра тое, як Валя знайшла рукавічку.)* Прачытайце яе. *(Трэці абзац.)* Якой частцы тэксту адпавядае малюнак? *(Апошняй.)* Прачытайце гэтую частку тэксту сам сабе. Вусна перакажыце яе. (Некалькі вучняў робяць пераказ апошняй часткі тэксту.)

**III. Замацаванне.**

Практыкаванне 77.

— Дапоўніце сказы аднароднымі членамі. Карыстайцеся словамі для даведкі. (Вучні па чарзе вусна дапаўняюць сказы патрэбнымі словамі.) У якіх сказах аднародныя члены з'яўляюцца дададзенымі членамі сказа? *(У другім і ў чацвёртым.)* Пры дапамозе чаго звязаны аднародныя члены ў сказе *Удзень і ўночы ліў дождж*? *(Пры дапамозе інтанацыі пералічэння і злучніка **і**.)* Ці стаіць коска паміж аднароднымі членамі ў гэтым сказе? Запішыце сказ і падкрэсліце злучнік. (Запіс з каменціраваннем. Аналагічна аналізуецца і запісваецца чацвёрты сказ.)

Практыкаванне 78.

— Прачытайце па стрэлках скорагаворку Міхася Пазнякова. (Вучні практыкуюцца ў выразным і правільным вымаўленні скорагаворкі.) Назавіце ў скорагаворцы дзейнік і выказнік. Як звязаны паміж сабой аднародныя дзейнікі? *(Інтанацыяй пералічэння і злучнікам **і**.)* Да якога слова ў сказе адносяцца дададзеныя члены? На якое пытанне яны адказваюць? Як называюцца гэтыя дададзеныя члены сказа? *(Аднародныя дададзеныя члены.)* Як яны звязаны паміж сабой? *(Інтанацыяй пералічэння.)*

**IV. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 79, правіла.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе дапоўніць сказы патрэбнымі злучнікамі. Спачатку вы запішаце сказы з аднароднымі дзейнікамі, потым — з аднароднымі выказнікамі, нарэшце — з аднароднымі дададзенымі членамі. Пры спісванні сказаў, у якіх паміж аднароднымі членамі стаяць коскі, не забывайце ставіць гэты знак прыпынку. (Пры неабходнасці вучні папярэдне чытаюць сказы і калектыўна дапаўняюць іх патрэбнымі злучнікамі.)

**V. Вынік урока.**

— Як звязваюцца паміж сабой аднародныя члены сказа? Як называюцца словы ***і, а, але***?

## Урок 16. Знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі

***Мэты:*** пазнаёміць з правіламі пастаноўкі коскі ў сказах з аднароднымі членамі, звязанымі толькі інтанацыяй або інтанацыяй і злучнікамі ***а, але***; выпрацоўваць пунктуацыйныя навыкі, адпрацоўваць уменне знаходзіць у сказах аднародныя члены, вызначаць іх сінтаксічную функцыю, складаць сказы з аднароднымі членамі, правільна інтанаваць іх; развіваць звязнае вуснае маўленне навучэнцаў; выхоўваць цікавасць да вучобы.

***Абсталяванне:*** карткі са сказам для самастойнай працы.

**І. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце сказы з аднароднымі дзейнікамі. *(Чацвёрты, шосты.)* Да якога слова ў сказе адносяцца дзейнікі *Ваня* і *тата*? *Бацькі* і *дзеці*? Як звязаны паміж сабой аднародныя дзейнікі ў гэтых сказах? *(Інтанацыяй пералічэння і злучнікам **і**.)* Ці стаіць коска паміж аднароднымі членамі, звязанымі злучнікам ***і***? *(Не.)* Прачытайце сказы з аднароднымі выказнікамі. *(Другі і трэці.)* Да якога слова ў сказе адносяцца выказнікі *свеціць, не грэе*? *Прыгатавала, павяла*? Як звязаны паміж сабой аднародныя выказнікі ў гэтых сказах? *(Інтанацыяй пералічэння і злучнікамі **а, але**.)* Ці стаіць коска паміж аднароднымі членамі, звязанымі злучнікамі ***а, але***? *(Так.)* Прачытайце сказы з аднароднымі дададзенымі членамі. *(Першы і пяты.)* Да якога слова ў сказе адносяцца дададзеныя члены *ціха, нерухома*? *Морквай, капустай*? Як яны звязаны паміж сабой? *(Інтанацыяй пералічэння і злучнікам **і**.)* Ці стаіць коска паміж аднароднымі членамі, звязанымі злучнікам ***і***? *(Не.)* Як вы думаеце, калі паміж аднароднымі членамі сказа ставіцца коска? (Вучні выказваюць сваё меркаванні.)

**ІІ. Новы матэрыял.**

**1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.**

— Сёння на ўроку мы знойдзем дакладны адказ на гэтае пытанне. Давайце праверым нашы меркаванні і прачытаем сказы з практыкавання 80.

**2. Праца з падручнікам.**

Практыкаванне 80.

— Прачытайце. (Вучні чытаюць сказы, называюць аднародныя члены і сродкі сувязі іх у сказе.)

Вы заўважылі, што сказы ілюструюць усе выпадкі пастаноўкі коскі паміж аднароднымі членамі. Ці ўсе выпадкі пастаноўкі знакаў прыпынку паміж аднароднымі членамі сказа мы пералічылі раней?

Праца з правілам.

Вучні самастойна чытаюць правіла на старонцы 54, настаўнік задае пытанне: калі паміж аднароднымі членамі сказа ставіцца коска?

**3. Самастойная работа па заданні на картках.**

Вучням раздаюцца карткі са сказам:

| |
|---|
| За акном ________________ грукоча гром. |

— Дапоўніце сказ слоўнікавым словам. (Вучні самастойна дапісваюць у сказ слова *грыміць*.) Ці трэба паставіць коску ў гэтым сказе? Дакажыце. (Адзін вучань знаходзіць у сказе галоўныя члены, называе аднародныя выказнікі, тлумачыць, што яны звязаны паміж сабой толькі інтанацыяй. Усе разам ставяць у сказе прапушчаны знак прыпынку.) Падкрэсліце ў сказе галоўныя члены.

**4. Праца з падручнікам.**

Практыкаванне 81.

— Прачытайце сказы першай групы. Замяніце іх адным сказам з аднароднымі членамі. (Вучні перабудоўваюць сказы ў адзін. Прапануецца некалькі варыянтаў: *За акном свішча і вые вецер. Вецер свішча і вые за акном. За акном свішча, вые вецер.*) Які з гэтых сказаў адпавядае схеме? Запішыце яго. (Запіс з каменціраваннем.) Чаму вы паставілі коску паміж аднароднымі членамі? (Вучні тлумачаць пастаноўку знака прыпынку. Аналагічная праца арганізоўваецца з астатнімі групамі сказаў.)

Развіццё маўлення.

— Разгледзьце малюнкі на старонцы 55. Як людзі навучыліся выкарыстоўваць сілу ветру? (Вучні даюць адказы на пытанне.) Безумоўна, гэта не поўны пералік выпадкаў выкарыстання сілы ветру людзьмі. Каго зацікавіла гэтае пытанне, той можа падрыхтаваць да наступнага ўрока невялікае паведамленне пра іншыя выпадкі выкарыстання сілы ветру чалавекам. Патрэбныя звесткі вы можаце знайсці ў дзіцячых энцыклапедыях, у інтэрнэце, атрымаць у бацькоў.

**III. Замацаванне.**

**Праца з падручнікам.**

Практыкаванне 82.

— Прачытайце прыказку. (Вучні чытаюць самі абе.) Ці можа быць такое, каб рыбак не налавіў ібе рыбы? *(Можа, калі рыба не трапляе на кру-к або калі рыбак ловіць рыбу для іншых, а са-нічога не застаецца.)* Калі рыба не трапляе на ючок, то кажуць: Рыбка ў рацэ ды ... *(не ў ру-.* (Вучні дагаворваюць вядомую прыказку.) Калі ак ловіць рыбу для іншых, а сабе налавіць не іявае, тады карыстаюцца прыказкай з практы-ння. Увогуле, прыказку *Рыбак рыбачыў, а рыбы ачыў* можна выкарыстоўваць заўсёды, калі раз-ідзе пра чалавека, які добра робіць пэўную ву для іншых, а для сябе тое ж самае зрабіць спявае або не можа.

— Спішыце, раскрываючы дужкі. Г прыказцы галоўныя члены сказа. (Зап раваннем.) Які знак прыпынку трэба сказе? Чаму?

Практыкаванне 83.

— Прачытайце скорагаворку. Якс не мае слова *люляе? (Калыша.)* Навуч разна і правільна вымаўляць скорагаво практыкуюцца ў правільным і выразным Вымавіце скорагаворку хутка. (Некаль спрабуюць вымавіць яе хутка і правільна.) ў сказе галоўныя члены. Вусна пастаўце п даданых членаў сказа. Якія даданыя чле паясняюць аднародныя выказнікі? Які зн пынку трэба паставіць у сказе на месцы пр Чаму? Запішыце скорагаворку па памяці. выканання задання праводзіцца ўзаемапр напісанага.)

**IV. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 84, правіла.

— Пры выкананні дамашняга практыкаванн неабходна будзе спісаць загадку, раскрыв дужкі, дапісаць у яе слова-адгадку, падкрэсл першым сказе галоўныя члены і паставіць у і трэбныя знакі прыпынку.

**V. Вынік урока.**

— Як звязваюцца паміж сабой аднародныя ны сказа? Калі паміж аднароднымі членамі ск ставіцца коска?

## Урок 17. Знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі

***Мэты:*** пазнаёміць з правіламі пастаноўкі коскі сказах з аднароднымі членамі, звязанымі злучнікам выпрацоўваць пунктуацыйныя навыкі, адпрацоўваць уменне знаходзіць у сказах і правільна інтанаваць аднародныя члены, вызначаць іх сінтаксічную функцыю; узбагачаць слоўнік навучэнцаў прыказкамі пра працу; выхоўваць эстэтычныя пачуцці.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце загадку. Якое слова-адгадку вы дапісалі ў яе? Чаму вецер названы ў загадцы вандроўнікам? (Выслухоўваюцца меркаванні вучняў.) Хто з вас падрыхтаваў дадатковыя звесткі пра тое, як чалавек выкарыстоўвае сілу ветру? (Заслухоўваюцца паведамленні падрыхтаваных вучняў. Паведамленне можа быць прыкладна такім: *Вецер раздзімае ветразі яхт і павялічвае хуткасць марскіх суднаў. Ён выкарыстоўваецца ў некаторых відах спорту (дэльтапланерызм, парусны спорт). Дзецям вецер патрэбны, каб запусціць паветранага змея.)*

— Назавіце ў першым сказе запісанай загадкі галоўныя члены. Якія з іх з'яўляюцца аднароднымі? *(Выказнікі.)* Як звязаны паміж сабой аднародныя выказнікі? Якія даданыя члены сказа паясняюць аднародныя выказнікі? Якія знакі прыпынку вы паставілі на месцы пропускаў? Чаму?

Калі паміж аднароднымі членамі коска?

**II. Новы матэрыял.**

**1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.**

— Калі вы прыгадвалі выпадкі пастаноўкі коскі паміж аднароднымі членамі, то нічога не сказалі пра тыя з іх, якія звязаны злучнікам ***і***. Чаму? (На аснове назіранняў, зробленых на некалькіх папярэдніх занятках, вучні могуць выказаць здагадку, што паміж аднароднымі членамі, звязанымі злучнікам ***і***, коска не ставіцца.) Сёння на занятках мы з вамі навучымся ставіць знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі, звязанымі злучнікам ***і***.

**2. Праца з падручнікам.**

Практыкаванне 85.

— Прачытайце сказы першай групы. Знайдзіце ў іх аднародныя члены. *(Аднародныя выказнікі **спявала, танцавала**.)* Якім словам адрозніваюцца гэтыя сказы? *(Злучнікам **і**.)* У якім сказе паміж аднароднымі членамі не ставіцца коска? *(У тым сказе, у якім аднародныя члены звязаны злучнікам **і**.)* Прачытайце сказы другой групы. Знайдзіце ў іх аднародныя члены. (Аднародныя дададзеныя члены *ружы, гваздзікі, рамонкі.*) Якім словам адрозніваюцца гэтыя сказы? *(Злучнікам **і**.)* Колькі злучнікаў ***і*** ў другім сказе? *(Адзін.)* Паміж якімі аднароднымі членамі ў гэтым сказе ставіцца коска, а паміж якімі не ставіцца? *(Паміж тымі, якія не звязаны злучнікам, ставіцца, паміж тымі, якія звязаны злучнікам **і**, не ставіцца.)* Колькі злучнікаў ***і*** ў трэцім сказе? *(Тры.)* Сапраўды, злучнік ***і*** паўтараецца перад кожным аднародным членам сказа. У такім выпадку коска паміж аднароднымі членамі сказа ставіцца? *(Так.)*

Праца з правілам.

— Настаўнік чытае правіла на старонцы 57 і задае пытанні: калі паміж аднароднымі членамі сказа не ставіцца коска? Калі паміж аднароднымі членамі сказа, звязанымі злучнікам ***і***, ставіцца коска?

Вучні перачытваюць правіла самастойна.

— Выпішыце з практыкавання 85 сказы, у якіх аднародныя члены звязваюцца злучнікам ***і***. (Пасля самастойнага выканання задання вучнямі праводзіцца ўзаемаправерка.)

Практыкаванне 86.

— Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць? З якой блізкай па значэнні прыказкай мы пазнаёміліся не так даўно? *(Работа не бясчэсціць, а крэпіць і цешыць.)* Якія яшчэ прыказкі пра працу вы ведаеце? *(Хто не працуе, таму не шанцуе. Найсмачнейшы хлеб ад сваёй працы. І інш.)* Назавіце ў сказе аднародныя члены. *(Аднародныя выказнікі.)* Выберыце тую схему сувязі аднародных членаў, якая адпавядае сказу. *(Другая схема.)* Чаму паміж аднароднымі членамі адсутнічае коска? *(Яны звязаны злучнікам **і**, які не паўтараецца.)*

**III. Замацаванне.**

Практыкаванне 87.

— Прачытайце сказы першай групы. Знайдзіце ў іх аднародныя члены. *(Аднародныя дададзеныя члены **у музеі, у парку**.)* Назавіце сказы, у якіх паміж аднароднымі членамі трэба паставіць коску. *(Першы, трэці.)* Дакажыце сваю думку. *(У першым сказе аднародныя члены звязаны паміж сабой толькі інтанацыяй, у трэцім — інтанацыяй і злучнікам **і**, які паўтараецца.)* Выпішыце той сказ, у якім коска паміж аднароднымі членамі не ставіцца. Падкрэсліце злучнік. (Запіс з каменціраваннем. Аналагічна аналізуецца другая група сказаў.)

Практыкаванне 88.

— Прачытайце вершаваныя радкі. (Адзін вучань чытае верш, астатнія сочаць за правільнасцю чытання.) Звярніцеся да слоўніка ў практыкаванні і адкажыце, якое значэнне мае слова *пасак*. Знайдзіце ў сказе галоўныя члены. *(Коцік сплёў, прыхаваў, адправіўся.)* Назавіце аднародныя члены сказа. *(Аднародныя выказнікі.)* Якія дададзеныя члены сказа паясняюць аднародныя выказнікі? Дзе ў сказе трэба паставіць коску на месцы пропуску? Дзе коску ставіць не трэба? Чаму? Спішыце сказ. Правільна афарміце яго на пісьме. (Запіс з каменціраваннем.)

**IV. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 89, правіла.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе спісаць сказы, знайсці ў іх аднародныя члены, падкрэсліць злучнікі, якія іх злучаюць, расставіць у сказах патрэбныя знакі прыпынку.

**V. Вынік урока.**

— Калі паміж аднароднымі членамі сказа не ставіцца коска? Калі паміж аднароднымі членамі сказа, звязанымі злучнікам ***і***, ставіцца коска?

## Урок 18. Знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі, якія маюць паясняльныя словы

***Мэты:*** пазнаёміць з правілам пастаноўкі коскі ў сказах з аднароднымі членамі, якія маюць паясняльныя словы; выпрацоўваць пунктуацыйныя навыкі, адпрацоўваць уменне знаходзіць у сказах аднародныя члены, вызначаць іх сінтаксічную функцыю, дапаўняць сказы аднароднымі членамі, правільна інтанаваць іх; узбагачаць слоўнік навучэнцаў прыказкамі пра працу; выхоўваць эстэтычныя пачуцці.

**Абсталяванне:** карткі з вершам для самастойнай працы.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце спачатку тыя сказы, у якіх вы не паставілі коску паміж аднароднымі членамі. *(Першы, трэці, пяты.)* Назавіце ў гэтых сказах аднародныя члены. Якім злучнікам яны звязаны? Чаму паміж імі не ставіцца коска? *(Злучнік **і** адзіночны.)* Прачытайце зараз той сказ, у якім вы паставілі коску паміж аднароднымі членамі, звязанымі злучнікам ***і***. *(Другі.)* Назавіце ў гэтым сказе аднародныя члены. Чаму паміж імі ставіцца коска? *(Злучнік **і** паўтараецца.)* Прачытайце чацвёрты сказ. Назавіце ў ім аднародныя члены. Як вы расставілі знакі прыпынку ў гэтым сказе? Чаму?

**II. Паўтарэнне.**

**1. Праца з падручнікам.**

Практыкаванне 90.

— Разгледзьце схемы сувязі аднародных членаў сказа на форзацы 1. З апорай на іх раскажыце правілы пастаноўкі знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі. (Некалькі вучняў расказваюць правіла пастаноўкі знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі. Потым навучэнцы вусна складаюць сказы, якія адпавядаюць схемам.)

Практыкаванне 91.

— Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць? Успомніце і назавіце прыказкі, блізкія па значэнні да прапанаванай. *(Работа не бясчэсціць, а крэпіць і цешыць. Праца чалавека трымае і ўзбагачае.)* Вызначыце ў сказе галоўныя члены. Якія з іх з'яўляюцца аднароднымі? *(Выказнікі.)* Як звязаны паміж сабой аднародныя выказнікі *не паганіць, корміць*? *(Інтанацыяй і злучнікам **а**.)* Як звязаны паміж сабой аднародныя выказнікі *корміць, поіць*? *(Толькі інтанацыяй.)* Чаму паміж імі стаіць коска? Як звязаны паміж сабой аднародныя выказнікі *поіць, вучыць*? *(Інтанацыяй і злучнікам **і**.)* Чаму паміж імі адсутнічае коска? Назавіце трэцяе слова ў сказе. *(Не.)* Як пішацца ***не*** з дзеясловамі? Назавіце ў прыказцы словы, што заканчваюцца на гук [ц']. Якімі літарамі перадаецца гэты гук на пісьме? Запішыце прыказку па памяці. (Пасля самастойнага выканання задання вучнямі арганізоўваецца самаправерка.)

**III. Новы матэрыял.**

**1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.**

— Сёння на ўроку мы будзем практыкавацца ў вызначэнні сувязі слоў у сказах з аднароднымі членамі, у правільным афармленні гэтых сказаў на пісьме.

**2. Праца з падручнікам.**

Практыкаванне 92.

— Прачытайце першы сказ. Звярніце ўвагу на стрэлкі. Вызначыце сувязь слоў у сказе па пытаннях. (Вучні знаходзяць у сказе дзейнік, ставяць пытанні спачатку да аднародных выказнікаў, а потым ад выказнікаў да дадзеных членаў сказа, якія іх паясняюць.) Як звязаны паміж сабой аднародныя члены сказа? *(Інтанацыяй пералічэння.)* Ці трэба ставіць паміж імі коску? *(Трэба.)* Звярніце ўвагу на месца пропуску знака прыпынку ў гэтым сказе. Дзе трэба паставіць коску: адразу пасля аднароднага выказніка ці пасля дададзенага члена сказа, які да яго адносіцца? *(Пасля дададзенага члена сказа.)* Сапраўды, аднародны член сказа не аддзяляецца коскай ад таго слова, якое яго паясняе. Запішыце першы сказ, пастаўце коску на месцы пропуску. (Запіс з каменціраваннем. Аналагічна аналізуюцца і запісваюцца астатнія сказы.)

Праца з рубрыкай «Завяжы вузялок!».

Настаўнік засяроджвае ўвагу на тым, што аднародныя члены сказа могуць мець пры сабе паясняльныя словы, і дае заданне вучням самастойна пазнаёміцца з матэрыялам рубрыкі на старонцы 59.

Практыкаванне 93.

— Прачытайце верш. *(Адзін вучань чытае ўголас, астатнія сочаць за правільнасцю чытання.)* Які ён: сур'ёзны ці жартоўны? Знайдзіце ў сказах верша галоўныя члены. Якія з іх з'яўляюцца аднароднымі? *(Выказнікі.)* Запішыце першы сказ. (Запіс з каменціраваннем.) Як звязаны паміж сабой аднародныя выказнікі ў сказе? *(Інтанацыяй пералічэння.)* Які знак прыпынку трэба паставіць у сказе? Дзе трэба паставіць коску? *(Пасля слова Мірон.)* Назавіце дададзены член у сказе. *(Булён.)* Якое слова ён паясняе? *(Зварыў.* Аналагічна аналізуюцца і запісваюцца астатнія сказы.*)*

**IV. Замацаванне.**

**1. Праца з падручнікам.**

Практыкаванне 94.

— Дапоўніце сказы тэксту аднароднымі членамі. Выкарыстайце словы для даведкі. (Вучні ў парах вусна дапаўняюць сказы патрэбнымі словамі.) Прачытайце тэкст, які ў вас атрымаўся. (1–2 вучні чытаюць тэкст.) Запішыце тэкст. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку. (Запіс з каменціраваннем.) У выдзеленых словах абазначце корань і прыстаўку. Растлумачце правапіс прыставак. (Выкананне задання з каменціраваннем.)

**2. Самастойная работа па заданні на картках.**

Вучням раздаюцца карткі з вершам:

Бусел

Даўганогі землямер
схапіў жабу за каўнер_
па траве павалачыў_
у канаве намачыў_
вострым носам дзеўбануў_
уздыхнуў_ і праглынуў.

*Васіль Вітка* [1, с. 90]

***Землямер*** *— чалавек, які раней мераў зямлю, вызначаў межы зямельных участкаў.*

— Прачытайце. З кім параўноўваецца бусел у вершы? Чаму? Падкрэсліце ў сказе галоўныя члены. Вусна пастаўце пытанні да дадзеных членаў сказа. Пастаўце, калі неабходна, коскі на месцы пропускаў. (Пасля самастойнага выканання задання вучнямі праводзіцца франтальная праверка.)

**V. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 95.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе спісаць сказы, паставіць патрэбныя знакі прыпынку паміж аднароднымі членамі сказа.

**VI. Вынік урока.**

— Якія словы могуць мець пры сабе аднародныя члены сказа? Ці аддзяляецца аднародны член сказа коскай ад таго слова, якое яго паясняе? Яшчэ раз звярніцеся да схем сувязі аднародных членаў сказа на форзацы 1. З апорай на іх раскажыце правілы пастаноўкі знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі.

## Урок 19. Знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі, якія маюць паясняльныя словы

***Мэты:*** адпрацоўваць уменне знаходзіць у сказах аднародныя члены, вызначаць іх сінтаксічную функцыю, правільна афармляць на пісьме сказы з аднароднымі членамі, якія маюць паясняльныя

словы, складаць сказы з аднароднымі членамі, правільна інтанаваць іх; развіваць граматычны лад маўлення, вуснае звязнае маўленне навучэнцаў; выхоўваць клапатлівыя адносіны да птушак.

***Абсталяванне:*** карткі са сказамі для самастойнай працы.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце першы сказ. Назавіце ў ім аднародныя члены сказа. Як аднародныя члены сказа звязаны паміж сабой? *(Злучнікам **і**.)* Ці прапушчана ў гэтым сказе коска паміж аднароднымі членамі? Дакажыце. Прачытайце другі сказ. Назавіце ў ім аднародныя члены сказа. Ці прапушчана ў гэтым сказе коска паміж аднароднымі членамі? Дакажыце. Прачытайце трэці сказ. Назавіце ў ім аднародныя члены сказа. Ці прапушчаны ў гэтым сказе коскі паміж аднароднымі членамі? Дакажыце. Які дадаены член сказа паясняе выказнік *гадуе*? *Аберагае*? Дзе вы паставілі коскі ў гэтым сказе? Падкрэсліце галоўныя члены сказа ў чацвёртым сказе. Якія з іх з'яўляюцца аднароднымі? *(Аднародныя выказнікі **пацягнуўся, вымыў**.)* Як яны звязаны паміж сабой? *(Інтанацыяй пералічэння.)* Якія дадаеныя члены сказа паясняюць выказнік *вымыў*? Ці з'яўляюцца яны аднароднымі? Як яны звязаны паміж сабой? *(Інтанацыяй пералічэння.)* Дзе вы паставілі коскі ў сказе?

**II. Замацаванне.**

**1. Самастойная работа па заданні на картках.**

Вучням раздаюцца карткі са сказамі:

> 1) Спалохаўся верабейка падляцеў да сасны і ў дупло нырнуў. *(Янка Галубовіч* [2, с. 78]*)* 2) Сонейка стамілася за лес закацілася. *(Авяр'ян Дзеружынскі)* 3) Сонца села за лясок і згубіла паясок. *(Авяр'ян Дзеружынскі)* 4) Дзед па лесе ціха кружыць і кіёчкам мох варушыць. *(Авяр'ян Дзеружынскі)* 5) Па галінках па былінках скача дожджык уначы. *(Авяр'ян Дзеружынскі* [3, с. 40, 73, 88]*)*

— Прачытайце сказы. Падкрэсліце ў іх галоўныя члены. Пастаўце, дзе трэба, коскі паміж аднароднымі членамі сказа. (Пасля самастойнага выканання задання вучнямі арганізоўваецца франтальная праверка.)

**2. Праца з падручнікам.**

Практыкаванне 96.

— Прачытайце тэкст. (Чытанне вучнямі па частках.) Што не падзялілі галубы? Як Андрэйка памірыў іх? Вызначыце тып тэксту. *(Апавяданне.)* На колькі частак можна падзяліць тэкст? (Вучні выказваюць свае меркаванні.) Пра што ідзе размова ў першай частцы? *(Пра тое, як халодным днём хлопчык назіраў за галубамі.)* Якую назву ёй можна даць? (Аналагічная праца арганізоўваецца з астатнімі часткамі тэксту.) Запішыце план тэксту, які ў нас атрымаўся.

*Прыкладны план:*

1. *Галубы каля лаўкі.*
2. *Не падзялілі ежу.*
3. *Мудрае рашэнне Андрэйкі.*
4. *Падзяка птушак.*

— Назавіце словы, якія дапамагаюць звязаць сказы ў тэксце. *(Словы галубы, птушкі і формы гэтых слоў. Галубы — яны — аднаму — пераможца. Паўтор слоў Андрэйка, пачастунак, лаўка. Аднакаранёвыя словы птушкі — птушынай. Словы батон — яго — пачастунак. Дзеясловы ў форме прошлага часу.)* Знайдзіце ў тэксце сказы з аднароднымі членамі. Выпішыце з іх аднародныя члены разам са словам, да якога яны адносяцца. (Адзін вучань працуе каля дошкі, астатнія запісваюць спалучэнні слоў у сшытках. Вучань каля дошкі запісвае спалучэнні слоў каля адпаведных пунктаў плана. У сшытках вучні запісваюць спалучэнні слоў у радок.)

Развіццё маўлення.

— Перакажыце тэкст па плане. Выкарыстайце запісаныя спалучэнні слоў. (Заслухоўваюцца вусныя падрабязныя пераказы некалькіх вучняў.)

Практыкаванне 97.

— Разгледзьце першы малюнак. Прачытайце спалучэнні слоў, запісаныя пад малюнкам. Складзіце сказ па малюнку, выкарыстаўшы гэтыя словы. *(Толя і Коля майстравалі кармушку для птушак.)* Назавіце ў ім аднародныя члены. Запішыце сказ. (Запіс з каменціраваннем. Вучні тлумачаць адсутнасць коскі паміж аднароднымі дзейнікамі. Аналагічна складаюцца і запісваюцца астатнія сказы.) Ці ўтвараюць запісаныя сказы тэкст? Дакажыце. Які загаловак можна даць тэксту? *(Напрыклад: «Кармушка для птушак».)*

Развіццё маўлення.

— Ці майстравалі вы самі кармушкі для птушак? З чаго можна зрабіць кармушкі? Чым можна частаваць птушак зімой? (Выслухоўваюцца адказы вучняў. Калі ўзнікаюць цяжкасці з адказамі на апошнія два пытанні, настаўнік можа прапанаваць навучэнцам па жаданні падрыхтаваць патрэбную інфармацыю да наступнага ўрока.)

Практыкаванне 98.

— Прачытайце скорагаворку. Якое значэнне мае слова *плот*? *(Агароджа.)* Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць скорагаворку. (Вучні практыкуюцца ў правільным і хуткім чытанні.) Назавіце ў сказе галоўныя члены. Вусна пастаўце пытанні да дадаеных членаў сказа. Якія дадаеныя члены сказа паясняюць аднародныя выказнікі? Які знак прыпынку трэба паставіць у сказе? Дзе трэба паставіць коску? *(Пасля слова плот.)* Чаму? Запішыце скорагаворку па памяці. Падкрэсліце ў ёй галоўныя члены сказа. (Пасля выканання задання праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.)

Практыкаванне 99.

— Сёння мы з вамі даведаемся, што такое акразагадка і разгадаем адну з такіх загадак. Звярніцеся да слоўніка ў практыкаванні. (Адзін вучань зачытвае азначэнне акразагадкі.) Ці разгадвалі вы падобныя загадкі? *(Так, разгадвалі і ў другім, і ў трэцім класе, толькі не ведалі, што яны так называюцца.)* Разгадайце яшчэ адну такую загадку. (Вучні чытаюць загадку самі сабе, называюць услых словаадгадку, запісваюць яго.) Знайдзіце ў загадцы сказ з аднароднымі членамі і прачытайце яго. (Адзін вучань чытае ўслых першы сказ, вызначае сувязь

слоў у ім па пытаннях.) Чаму паміж аднароднымі членамі ў сказе не пастаўлена коска?

**III. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 100.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе спісаць сказы, паставіць патрэбныя знакі прыпынку паміж аднароднымі членамі і падкрэсліць злучнікі.

**IV. Вынік урока.**

— Звярніцеся да схем сувязі аднародных членаў сказа на форзацы 1. З апорай на іх раскажыце правілы пастаноўкі знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі.

## Урок 20. Знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі

***Мэты:*** адпрацоўваць уменне знаходзіць у сказах аднародныя члены, вызначаць іх сінтаксічную функцыю, дапаўняць сказы аднароднымі членамі; выпрацоўваць інтанацыйныя і пунктуацыйныя навыкі, развіваць граматычны лад маўлення, лагічнае мысленне навучэнцаў; выхоўваць цікавасць да вывучэння беларускай мовы.

***Абсталяванне:*** карткі са сказамі.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце сказ з аднароднымі дадзенымі членамі. *(Трэці.)* Якія знакі прыпынку вы паставілі ў ім? Чаму? Якія члены сказа з'яўляюцца аднароднымі ў астатніх сказах? *(Аднародныя выказнікі.)* Прачытайце спачатку той сказ, у якім не трэба ставіць коскі паміж аднароднымі выказнікамі. *(Другі.)* Якім злучнікам звязаны ў гэтым сказе аднародныя члены? *(Злучнікам **і**.)* Прачытайце тыя сказы, у якіх аднародныя выказнікі звязаны злучнікамі ***а, але***. *(Першы, чацвёрты.)* Дзе вы паставілі коскі ў гэтых сказах? Як звязаны паміж сабой аднародныя выказнікі ў пятым сказе? Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў гэтым сказе.

— Раскажыце яшчэ раз правілы пастаноўкі знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі. (Заслухоўваюцца адказы 1–2 вучняў.)

**II. Паўтарэнне.**

**1. Праца з падручнікам.**

Практыкаванне 101.

— Прачытайце першую групу сказаў. Знайдзіце ў сказах аднародныя члены. Якую ролю ў сказе (дзейнікі, выказнікі або даданыя члены сказа) яны выконваюць? Як яны звязаны паміж сабой? Які сказ у групе лішні? Чаму? *(Другі сказ. У астатніх сказах аднародныя даданыя члены сказа звязаны злучнікам **і**, паміж імі не ставіцца коска. Аналагічна аналізуюцца астатнія групы сказаў. У другой групе лішнім з'яўляецца сказ, у якім аднародныя дзейнікі звязаны злучнікам **і**, які паўтараецца. У трэцяй групе — сказ з аднароднымі даданымі членамі, звязанымі інтанацыяй пералічэння.)*

Праца са слоўнікавым словам **ледзьве**.

— Сёння мы пазнаёмімся з правапісам слоўнікавага слова *ледзьве*. Хто з вас можа растлумачыць яго значэнне? (Калі вучні не ведаюць значэння слова, то настаўнік тлумачыць: *ледзьве — насілу, з вялікімі цяжкасцямі*. Тое ж значэнне мае і слова-сінонім *ледзь*.) Давайце вымавім гэтае слова ўсе разам. Назавіце па парадку гукі ў гэтым слове. Колькі гукаў у слоўнікавым слове? Колькі літар? Чаму гукаў у ім менш, чым літар? Назавіце зычныя гукі ў гэтым слове? Якія яны ўсе? *(Мяккія, звонкія.)* Якімі літарамі перадаецца на пісьме мяккасць гэтых гукаў? Запішыце слоўнікавае слова, прагаворваючы яго так, як будзеце пісаць. (Самастойны запіс слова вучнямі.)

Практыкаванне 102.

— Прачытайце сказы. (Адзін вучань чытае, астатнія сочаць за правільнасцю чытання.) Перабудуйце іх у сказы з аднароднымі членамі. Для гэтага замест выдзеленых слоў выкарыстайце словы для даведкі. Якімі словамі можна замяніць слова *дзеці* ў першым сказе? *(Хлопчыкі і дзяўчынкі.)* Прачытайце сказ, які атрымаўся. Якімі словамі можна замяніць слова *гуляў* у другім сказе? *(Бегаў, скакаў.)* Прачытайце сказ, які атрымаўся. Якое слоўнікавае слова сустрэлася ў ім? Якое значэнне яно мае ў сказе? *(Амаль, чуць не.)* Якімі словамі можна замяніць слова *быструю* ў трэцім сказе? *(Рухавую, жвавую.)* Прачытайце сказ, які атрымаўся. Запішыце перабудаваныя сказы. (Запіс з каменціраваннем.)

Практыкаванне 103.

— Прачытайце загадку. Звярніцеся да слоўніка ў практыкаванні і растлумачце значэнне слова *прыдбалі*. Назавіце слова-адгадку. *(Бараны.)* Знайдзіце ў сказе галоўныя члены. Якія з іх з'яўляюцца аднароднымі? *(Аднародныя выказнікі прыдбалі, гуляюць, спяць.)* Як яны звязаны паміж сабой? *(Прыдбалі, гуляюць — інтанацыяй пералічэння, гуляюць і спяць — інтанацыяй і злучнікам **і**.)* Пастаўце пытанні да даданых членаў сказа, якія паясняюць аднародныя выказнікі. Якога знака прыпынку не хапае ў сказе? *(Коскі.)* Дзе яе трэба паставіць? *(Пасля слова* кажушкі.*)* Чаму? Чаму не трэба ставіць коску перад злучнікам ***і***? Спішыце сказ, правільна афармляючы яго на пісьме, падкрэсліце ў ім галоўныя члены. (Пасля самастойнага выканання задання праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.)

Практыкаванне 104.

— Прачытайце скорагаворку. Якое значэнне мае слова *атрос*? *(Трасучы, ачысціў дрэва.)* Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць скорагаворку. (Вучні практыкуюцца ў правільным і хуткім чытанні.) Назавіце ў сказе галоўныя члены. Як яны звязаны паміж сабой? *(Інтанацыяй пералічэння і злучнікам **а**.)* Вусна пастаўце пытанні да даданых членаў сказа. Якія даданыя члены сказа паясняюць аднародныя выказнікі? Які знак прыпынку трэба паставіць у сказе? Дзе трэба паставіць коску? *(Перад злучнікам **а**.)* Чаму? Растлумачце правапіс выдзеленых літар у словах. Запішыце скорагаворку па памяці. (Пасля выканання задання праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.)

**2. Калектыўная работа па заданні на картках.**

Вучням раздаюцца карткі з незакончанымі сказамі:

☐ Рыбак злавіў у рацэ ________________.
☐ ________________ растуць у садзе.
☐ На стадыене дзеці ________________.

— Вусна дапоўніце першы сказ аднароднымі членамі. (Вучні прапаноўваюць розныя варыянты дапаўнення сказа аднароднымі дадзенымі членамі. Аналагічна дапаўняюцца аднароднымі членамі астатнія сказы.) Запішыце свае варыянты сказаў. Пастаўце знак ✓ у квадрацік насупраць сказа з аднароднымі дзейнікамі. (Пасля запісу сказаў вучнямі арганізоўваецца ўзаемаправерка.)

**III. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 105.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе вызначыць межы сказаў у тэксце. Потым трэба будзе запісаць тэкст, правільна афармляючы сказы на пісьме і ўстаўляючы ў словы прапушчаныя літары.

**IV. Вынік урока.**

— Раскажыце правілы пастаноўкі знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі. Пры неабходнасці карыстайцеся схемамі на форзацы.

На дошцы запісваецца схема сказа:

________ ________ *але* ________ .

— Вусна складзіце сказ па схеме. (Вучні складаюць розныя варыянты сказаў.) Які знак прыпынку трэба паставіць перад злучнікам **але**?

## Урок 21. Навучальнае сачыненне

***Мэты:*** выпрацоўваць уменне вызначаць тып тэксту, складаць на аснове рэпрадукцыі карціны тэкст-апісанне па плане і апорных словазлучэннях; узбагачаць слоўнік вучняў вобразна-выяўленчымі сродкамі мовы, развіваць звязнае пісьмовае маўленне; выхоўваць эстэтычныя пачуцці.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Колькі сказаў у тэксце, які вы запісалі дома? *(Шэсць.)* Прачытайце першы сказ. Назавіце ў ім аднародныя члены сказа. Як яны звязаны паміж сабой? Ці трэба ставіць коску паміж імі? (Аналагічна аналізуюцца астатнія сказы, тлумачыцца правапіс слоў з прапушчанымі літарамі.) Якое слоўнікавае слова сустрэлася ў тэксце? *(Ледзьве.)* У якім значэнні яно ўжыта ў сказе? *(Амаль не (калыхаліся).)*

— Прачытайце словы, запісаныя на дошцы: *ледзь, многа, ледзьве, доўга*. Запішыце ў сшытку словы-сінонімы.

**II. Паўтарэнне.**

**Праца з падручнікам.**

Практыкаванне 106.

— Прачытайце тэкст. (Адзін вучань чытае тэкст, астатнія сочаць за правільнасцю чытання.) Што апісваецца ў ім? *(Першы снег.)* Як яшчэ называюць снег, які толькі што выпаў? Да якога тыпу належыць тэкст? *(Апісанне.)* Які загаловак яму можна даць? *(«Першы снег», «Прывітанне зімы».)* Знайдзіце ў тэксце сказы з аднароднымі членамі. *(Трэці — пяты.)* Выпішыце іх. (Запіс з каменціраваннем.) Які злучнік звязвае аднародныя члены ў сказах?

Практыкаванне 107.

— Выразна прачытайце вершаваныя радкі. (Вучні ў парах практыкуюцца ў выразным чытанні.) Растлумачце правапіс выдзеленых літар у словах. (Вучні па чарзе праводзяць арфаграфічны разбор слоў.) Назавіце ў сказе аднародныя члены. Як яны звязаны паміж сабой? *(Інтанацыяй пералічэння.)* Якога знака прыпынку не хапае ў сказе? Дзе трэба паставіць коскі? Запішыце сказ па памяці. Правільна афарміце яго на пісьме. (Пасля запісу сказа вучнямі арганізоўваецца ўзаемаправерка.)

**III. Праца па развіцці маўлення.**

Практыкаванне 108.

**1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.**

— Сёння мы з вамі будзем пісаць сачыненне на тэму «Першы снег».

**2. Збіранне матэрыялу.**

— Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Станіслава Жукоўскага «Першы снег». Па якіх прыметах можна здагадацца, што мастак адлюстраваў надыход зімы? *(Снег пакрыў лісце на дрэвах. На дрэвах ёсць яшчэ зялёнае лісце. Не замерзла рэчка.)* Якія фарбы пераважаюць на карціне? *(Цёмна-сінія, белыя і светла-блакітныя.)* Які настрой яна стварае? *(Радасны і ўрачысты.)* Што адлюстравана ў цэнтры карціны? Што знаходзіцца на яе заднім плане? Дзе ляжыць снег? *(На дрэвах, на дахах дамоў, на зямлі, на мосце.)*

**3. Сістэматызацыя сабранага матэрыялу згодна з прапанаваным планам.**

— Пазнаёмцеся з планам будучага сачынення. (Вучні самастойна чытаюць план.) Які тып тэксту мы будзем ствараць? *(Апісанне.)* Што трэба будзе апісаць у першай частцы тэксту? Прачытайце спалучэнні слоў першай групы. Паспрабуйце апісаць заснежаную зямлю і дрэвы з выкарыстаннем гэтых спалучэнняў слоў. *(Напрыклад: Ноччу бушавала завіруха. Яна не пашкадавала і насыпала снегу. Раніцай усё сціхла. Снег накрыў белым покрывам зямлю, лёгкім пухам лёг на дрэвы і кусты.)*

— Што трэба будзе апісаць у другой частцы тэксту? Прачытайце спалучэнні слоў другой групы. Паспрабуйце апісаць мост і дамы з выкарыстаннем гэтых спалучэнняў слоў. *(Напрыклад: Ён упрыгожыў белымі шапкамі дамы, пабяліў мост.* Аналагічна аналізуюцца наступныя пункты плана і апорныя словазлучэнні, складаюцца астатнія часткі тэксту.*)*

**4. Стварэнне вуснага звязнага выказвання па плане.**

— Паспрабуйце вусна апісаць першы снег, выкарыстаўшы план і апорныя словы. (Заслухоўваюцца вусныя апісанні 1–2 вучняў.) *(Напрыклад:*

*Ноччу бушавала завіруха. Яна не пашкадавала і насыпала снегу. Раніцай усё сціхла. Снег накрыў белым покрывам зямлю, лёгкім пухам лёг на дрэвы і кусты. Ён упрыгожыў белымі шапкамі дамы, пабяліў мост і зусім не крануў рэчкі. Яна яшчэ не замерзла. Рэчка ўецца цёмнай стужкай між засне-*

*жаных берагоў. У яе халоднае люстэрка ўрачыста ўглядаюцца прыбраныя ў белыя футры дрэвы.*

*Першы снег змяніў усё навокал і ўпрыгожыў прыроду, як чараўнік.)*

**5. Арфаграфічная і пунктуацыйная падрыхтоўка.**

Падчас вусных адказаў вучняў звяртаецца ўвага на выкарыстаныя імі сказы з аднароднымі членамі. Тлумачыцца пастаноўка знакаў прыпынку ў гэтых сказах. У апорных спалучэннях слоў настаўнік просіць знайсці словы, у якіх трэба правяраць правапіс парных звонкіх і глухіх зычных (*лёгкім, лёг, шапкамі, стужкай*). Вучні падбіраюць да гэтых слоў праверачныя. Звяртаецца ўвага на словы з падвоенымі літарамі (*ноччу, уецца, углядаюцца*), тлумачыцца правапіс літары **ў** у словах.

**6. Напісанне сачынення вучнямі.**

**7. Самаправерка напісанага.**

Настаўнік фіксуе ўвагу вучняў на тым, што неабходна перачытаць напісанае сачыненне двойчы. Пры першасным чытанні трэба прасачыць правільнасць выкладу зместу. Пры другасным — правільнасць напісання слоў, пастаноўкі знакаў прыпынку ў сказах.

**IV. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 109, пытанні для абагульнення на с. 68.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе зрабіць заданне, падобнае таму, што вы рабілі да гэтага ўрока. Акрамя таго, неабходна будзе вусна адказаць на пытанні па тэме «Сказ».

**V. Вынік урока.**

— Да якога тыпу належыць тэкст, які вы склалі і запісалі на ўроку? Якія цяжкасці ўзніклі пры складанні тэксту «Першы снег»? Знайдзіце ў запісаным тэксце сказы з аднароднымі членамі. Прачытайце іх. (Вучні зачытваюць тыя сказы з аднароднымі членамі, якія яны выкарысталі ва ўласных тэкстах.) Якія знакі прыпынку вы паставілі ў іх? Чаму?

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Вітка, В.* Урокі роднага слова : вершы, казкі, апавяданні : для мал. шк. узросту. / В. Вітка; уклад. Т. С. Тарасава; маст. М. Р. Казлоў. — Мінск : Юнацтва, 2001. — 264 с.
2. *Галубовіч, Я.* Дзівосы роднай прыроды : апавяданні і казкі для дзяцей / Янка Галубовіч ; мастак К. Г. Разанкова. — Мінск : Пачатковая школа, 2012. — 168 с.
3. *Дзеружынскі, А. С.* Вяселікі : выбранае : вершы, паэмы, казкі, смешкі, пацешкі, небыліцы, жарты : для малодшага школьнага ўзросту / Авяр'ян Дзеружынскі ; малюнкі А. Лось. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1979. — 318 с.

***Свірыдзенка В. І.,***
*кандыдат педагагічных навук,*
*дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства БДПУ*

# Практыкаванні са слоўнікавымі словамі

## IV клас*

***Дэлегацыя.***

*1. Сярод прапанаваных складоў адшукайце і зафарбуйце тыя, з якіх можна скласці слоўнікавае слова. Злучыце склады так, каб атрымалася слоўнікавае слова.*

[дэ] [цы] [ле] [де] [га] [ци] [я]

*2. Расшыфруйце слоўнікавае слова і запішыце яго.*

| 4 | 1 | 6 | 9 | 3 | 5 | 8 | 2 | 7 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| е | д | а | я | л | г | ы | э | ц |

*Падкрэсліце літары, якія абазначаюць цвёрдыя зычныя гукі.*

*3. Дапоўніце сказы слоўнікавымі словамі. Знайдзіце і падкрэсліце асабовы займеннік.*

У Мінск прыехала ____________ з Кітая. Яна наведала Нацыянальную бібліятэку Беларусі. Гасцям спадабалася галоўная __________ горада — праспект Незалежнасці.

*4. Дапоўніце сказ патрэбнымі словамі.*

Група дэлегатаў, прадстаўнікоў якога-небудзь калектыву, якой-небудзь дзяржавы — гэта ______

Выбраны або прызначаны прадстаўнік якой-небудзь арганізацыі, калектыву, дзяржавы — гэта ________.

* Малюнкі да слоўнікавых слоў змешчаны на каляровай укладцы.